аб'ектыўны і непрадузяты погляд на вытокі, тыпалогію, сучасны стан і перспектывы традыцыі. Выкарыстанне гэтага метаду дазволіла З. Я. Мажэйка падрыхтаваць серыю сусветнавядомых антрапалагічных фільмаў па традыцыйнай культуры беларусаў.

**ЛІТАРАТУРА**


1. *Можейко, З. Я.* Календарно-песенная культура Белоруссии: опыт системно-типологического исследованія / З. Я. Можейко. – Минск: Наука и техника, 1985. – С. 10.


## ТЭОРЫЯ КАНТАНАЦЫІ ІГАРА МАЦІЕЎСКАГА Ў ФАЛЬКЛАРЫСТЫЦЫ

**Тэорыя кантанацыі Ігара Маціеўскага ў фалькларыстыцы** – *навуковае даследаванне традыцыйнай музыкі, заснаванае на тэорыі кантанацыі, дзе музыка аналізуецца не толькі гукавысотна і рытмічна, але і прасторава-акустычна.* На падставе параўнальнага мастацтвазнаўства, вывучэння сувязяў музыкі з іншымі відамі мастацтваў, формаў мастацкай дзейнасці носьбітаў традыцыйнай культуры, загадчык сектара інструментазнаўства Расійскага інстытута гісторыі мастацтваў, доктар мастацтвазнаўства, прафесар І. У. Маціеўскі тэарэтычна і практычна распрацаваў падыходы да даследавання генезісу, тыпалогіі, заканамернасцяў захавання і трансляцыі музыкі вуснай традыцыі. Даследаванні музычнага фальклору з дапамогай методык тэорыі кантанацыі з'яўляюцца цікавымі і карыснымі і аналітыкам фальклору, і фалькларыстам-практыкам, наколькі дапамагаюць зразумець заканамернасці музычнага фальклору (увогуле – заканамернасці мастацтва вуснага тыпу) і забяспечыць яго якасную (без страт і фальсіфікацый) пераемнасць.

**ЛІТАРАТУРА**


1. *Мациевский, И. В.* В пространстве музыки / И. В. Мациевский. – СПб.: РИИИ, 2011. – Т. 1. – С. 6–10.


*Віёла Казаніна*

## АНТЫКВАРЫЯНІЗМ У ВЫВУЧЭННІ ЭТНАКУЛЬТУРЫ

**Антыкварыянізм у вывучэнні этнакультуры** (ад *лац.* antiquus – старажытны) – *напрамак гістарычнай навукі, які займаецца збіраннем, вывучэннем, публікацыяй старажытнасцяў.* Заявіўшы пра сябе ў Брытаніі XVI – XVII стагоддзяў, ён потым пашырыўся ў Еўропе. Збіральнікі

артэфактаў мінулага (антыкварыі) праявілі актыўнасць у Брытаніі XVI – XVII стагоддзяў, якая ўвяла моду на зацікаўленасць да сваёй лакальнай гісторыі, дзе ўзніклі цэнтры антыкварнага і гістарычнага пошуку: Елізавецінскае таварыства антыквараў (Лондан, 1585), бібліятэка Томаса Бадлея (Оксфард, 1602). Адным з першых тэарэтыкаў антыкварыянізму стаў лорд-канцлер Англіі, філосаф, гісторык і палітык Фрэнсіс Бэкан. Ён пісаў пра веды, заснаваныя на вывучэнні старажытнасцяў, што: «...старажытнасці маюць справу... з рэшткамі гісторыі..., а калі ўспаміны пра падзеі зніклі, а самі яны паглынутыя багнай забыцця... працавітыя і дасведчаныя людзі ... з настойлівасцю і скрупулёзнай дбайнасцю імкнуцца... захаваць хаця б некаторыя звесткі, аналізуючы генеалогіі, календары, надпісы, помнікі, манеты, уласныя імёны і мову, этымалогію, прыказкі, паданні, архівы і разнастайныя прылады».

### ЛІТАРАТУРА


*1. Бэкон, Ф.* О достоинстве и приумножении наук / Ф. Бэкон // Сочинения в двух томах. - М.: Мысль, 1971. – Т. 1. – С. 87–546.


## АРТ-РЫНАК ФАЛЬКЛОРНЫ

**Арт-рынак фальклорны** – *сукупнасць суб'ектаў і інстытутаў, якія ўзаемадзейнічаюць адзін з адным і якія або атрыбутуюць і ўводзяць у абарот, або спажываюць вынікі творчасці носьбітаў аўтэнтычнай фальклорнай традыцыі і тэхналогіі традыцыйных рамёстваў.* У сучаснай Беларусі прадстаўлены дзейнасцю захаваўшыхся аўтэнтычных вясковых выканаўцаў і майстроў, а таксама маладых пост-фальклорных пераемнікаў традыцыі – гараджан. Феномен вясковага маладзёжнага пераймання фальклорнага выканальніцтва і мастацкіх рамесных традыцый на дастатковым для рынкавых умоў узроўні сёння – выключэнне, а не правіла, і над гэтай праблемай варта працаваць фалькларыстам і арт-менеджэрам.

### ЛІТАРАТУРА


*1. Казаніна, В.* Да пытання вызначэння навукова-тэарэтычнага паняцця «арт-рынак антыкварных твораў мастацтва» / В. Казаніна // Роднае слова. – 2017. – №11 (359). – С. 89 – 91.


## АРТ-РЫНАК ЭТНАТАВАРАЎ

**Арт-рынак этнатавараў** – *сукупнасць суб'ектаў і інстытутаў, якія ўзаемадзейнічаюць адзін з адным, а таксама або атрыбутуюць і ўводзяць*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ